5.Интернет-энциклопедия Википедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ru-wiki.ru/wiki/Гендер – Дата доступа: 24.02.17

6. Ей комфортно быть в этой профессии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rustheatre.by/images/doc/erenkova_10.jpg – Дата доступа: 24.02.17

7. Спектакли-инсталляции Кирстен Дельхольм [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ptzh.theatre.ru/2005/40/110/ – Дата доступа: 24.02.17

8. Профессия «Режиссер»: описание, плюсы и минусы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fb.ru/article/246481/professiya-rejisser-opisanie-plyusyi-i-minusyi – Дата доступа: 24.02.17

**Ярмоленка В.Я.,** студэнтка 520н гр.
Навуковы кіраўнік – Бадунова І.І.

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ТАНЦЫ РОЗНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ ПОЛЬШЧЫ

Польшча налічвае вялікае мноства рэгіёнаў. Кожны рэгіён мае сваю цікавую харэаграфічную культуру. Каб гэта зразумець, разгледзім рэгіянальную структуру тэрыторыі Польшчы. З даўніх часоў, насельніцтва Польшчы было падзелена на дробныя плямёны, пазней, гэта спрыяла стварэнню рэгіёнаў, а менавіта – невялікіх геаграфічна-гістарычных тэрыторый. Назвы некаторых плямёнаў бяруць свой пачатак ад назвы геаграфічнай тэрыторыі. Напрыклад:

• Pomorze – бок паўднёвага ўзбярэжжа Балтыйскага мора ад вусця Одэра да Віслы, першасная тэрыторыя палянаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

• Śląsk – у басейне ракі верхняга Одэра. Гістарычна, гэты рэгіён быў у межах польскай дзяржавы і складаўся з тэрыторый плямёнаў: Ślężan, Dziadoszan. Bobrzan, Gołęszyców, Opolan;

• Małopolska – тэрыторыя старажытнага племені Wiślan;

• Mazowsze – сярэдні бок ракі Вісла і ніжнімі яе плынямі: Bzury, Pilicy, Narwi, Wieprza.

З часам вылучыліся наступныя польскія рэгіёны:

• Warmia i Mazury – Warmia ў гістарычных межах, гэтай тэрыторыяй валодалі Вармінскія біскупы; Mazury – на паўднёвых тэрыторыях даўняй Княжацкай Прусіі;

• Kujawy – на прасторы паміж Віслай і верхняга Нотеца, паўстала як асаблівы ўчастак на рубяжы XII і XIII ст. (Таксама ў той час вылучыліся землі: dobrzyńska i chełmińska);

• Podlasie – на паўночным усходзе часткова заселеныя тэрыторыі мазавецкага племені;

• Orawa i Spisz – тэрыторыя Заходніх Карпат; узнік як рэгіён у сярэднявеччы, цяпер яны падзеленыя палітычнай мяжой паміж Польшчай і Славакіяй.

Першыя музычныя запісы і харэаграфічныя апісанні польскіх сельскіх танцаў XIX ст. прыведзены ў шматтомных працах О.Кальберга (22.02.1814– 03.06.1890) – знакамітага польскага этнографа, які фіксаваў мелодыі і тэксты народных песень і казак. Ён распачаў цэлы шэраг паездак, сабраў велізарны этнаграфічны матэрыял (адных музычных мелодый – больш за 8 тысяч) і большай часткай на ўласныя сродкі выдаў яго ў 28 тамах. Пры гэтым, акрамя ўласных экспедыцыйных матэрыялаў, карыстаўся этнаграфічнай інфармацыяй аматараў з розных рэгіёнаў Польшчы (настаўнікаў, святароў, сялян). Аб народных танцах больш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ранняга часу маюцца толькі адрывістыя звесткі ў польскіх хроніках, мемуарах; яны намаляваныя на некаторых старадаўніх малюнках.

Шмат арыгінальных сельскіх танцаў захавалася ў Польшчы да гэтага часу. Адны з іх выконваюцца аднолькава ва ўсёй Польшчы, іншыя, пры наяўнасці агульнапольскіх рыс, маюць мясцовыя асаблівасці ў музычным суправаджэнні і танцавальных па. Адрозніваюцца яны і назвамі.

Самыя старыя з польскіх танцаў звязаныя з сямейнымі абрадамі (нараджэнне, вяселле) або з земляробчай гаспадаркай. З вясельных танцаў больш за ўсё вядомыя – chmiel (хмель), taniecchmielowy і Przepioreczka. Да старажытнага славянскага абраду «собутке» ставяцца собутковае кола і карагоды дзяўчат вакол вогнішчаў напярэдадні свята святога Яна. Гэтыя і іншыя абрадавыя танцы некалі мелі, мабыць, магічны сэнс.

Асаблівую группу складаюць танцы-гульні, якія выконваюцца па ўсёй Польшчы. Гэтыя танцы імітуюць працу чалавека. Яны ўзніклі, відаць, пад уплывам горада і паказваюць развіццё рамёстваў.

Вылучаецца, нарэшце, группа танцаў грамадскага характару. Іх танчаць па самых розных падставах: на вечарах, сельскіх гуляннях, на вяселлях і іншых сямейных імпрэзах. Сярод іх першае месца займаюць – «Oberek», які належыць да группы танцаў так званых мазурачных рытмаў, і полька.

Абрадавыя танцы і танцы-гульні часцей за ўсё суправаджаюцца спевам. У грамадскіх танцах вялікую ролю адыгрываюць прыпеўкі – кароткая песенка з імправізаваным тэкстам, якую спявае сольна танцор. Песенка гэтая спаўняецца пад час танца, ці да яго пачатку.

Музычнае і рытмічнае разнастайнасць сялянскіх танцаў праяўляецца ў іх рэгіянальных асаблівасцях:

- на поўдні Польшчы пераважаюць танцы на музычны памер 2/4;
- у цэнтральнай частцы Польшчы дамінуюць мелодыі памерам на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3/4;

- на поўначы ў роўнай меры распаўсюджаныя рытмы цотныя і няцотныя;
- цэнтральныя польскія вобласці характарызуюцца рытмам мазуркі;
- для паўднёвых абласцей найбольш тыповыя рытмы танца кракавяк, якія рэдка сустракаюцца ў астатняй Польшчы.

Польскія танцы – мазурка, кракавяк, паланез, куявяк і інш, развіваліся і ўдасканальваліся на сапраўды народных асновах.

У XVI–XVII стст. шляхта пераняла ад сялян рытмы «пешага» танца, але значна іх перапрацавала. У шляхецкім выкананні гэты танец набыў асаблівую пышнасць і імпазантнасць. У такім выглядзе ён стаў вядомы ў Парыжы, дзе падвергнуўся апрацоўцы прафесійных балетмайстраў і атрымаў назву «паланэз». У XVIII ст. паланэз, гэта значыць – польскі танец, распаўсюдзіўся па ўсёй Еўропе. Кракавяк, мазур, куявяк ў апрацоўцы шляхты і пры пастаноўцы іх на сцэне таксама набылі яшчэ большую адточанасць рухаў, скончанасць і вытанчанасць малюнка. Таксама вылучылася адна з агульных рысаў, польскіх танцаў – паступовае ўхутчэнне тэмпу. У большасці выпадкаў танец складаецца з двух частак, з якіх першая ідзе спакойна, другая – хутка, з іншым крокам. Танец, пачаты спакойна, нярэдка заканчваецца ў галавакружнам тэмпе, а часам пераходзіць нават у іншы танец з той жа характарыстыкай рытму (напрыклад, пасля абэрака адразу ж пачынаюць танцаваць куявяк).

Распаўсюджванню народных і фальклорных танцаў у Польшчы нямала спрыялі многія таленавітыя польскія кампазітары, асабліва Фэдэрык Шапэн, Стані́слаў Манюшка, Ка́раль Шыманоўскі, якія напісалі па іх матывах выдатныя музычныя творы.

У жыхароў асобных рэгіёнаў атрымалася захаваць да сённяшняга часу вялікую колькасць культурных асаблівасцяў. Некаторыя групы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насельніцтва, напрыклад Kaszuby на Pomorzu, захавалі мову, якая значна адрозніваецца ад польскай мовы. Яны могуць ганарыцца не толькі сваімі звычаямі, асаблівым дыялектам, рэгіянальнымі ўборамі, песнямі і танцамі, але і нават кулінарнымі асаблівасцямі, спосабамі ўпрыгожвання або пабудовы дамоў.

Даследаванне культур розных краін паказвае, што ў кожнай з іх ёсць як падабенства, так і адрозненні. Нацыянальная культура адной краіны адрозніваецца ад нацыянальнай культуры іншай краіны, а разам з тым яны ўваходзяць у агульнае паняцце – сусветная культура.


1. Dziewanowska, Ada. Polish Folk Dances & Songs – a Step by Step Guide. New York: Hippocrene Books,.T. 30 z. 2. 2, s. 67 – 74, 1999. – 249 s.
2. Grabowski, Józef. Sztuka ludowa. Formy i regiony w Polsce. – Warszawa : Arkady, 1967. – 519 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Яроцкая Р.А.,** студентка 312 группы
Научный руководитель – Абрамович П.А.

## АЛТИМАТ КАК СРЕДСТВО МОТИВАЦИИ СТУДЕНТОВ К ЗАНЯТИЮ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРОЙ

Наша жизнь наполнена разными ситуациями и жизненными оценками. Иногда все жизненные ситуации и оценки бывают неожиданными и не знакомыми для нас. Когда мы попадаем в непривычную для нас ситуации, мы следуем закрепившейся, где-то глубоко в нас, привычной модели поведения. И самое интересное, что моделями, которыми мы пользуемся, не всегда несут позитивный характер.

В мировой науке и мировыми исследователями, была установлена положительная связь мотивационных ориентайций и иновационных